ён чуе ў дзеянні музыку". (Цыт. па: Домрина Е.Н. Беседы о музыке. — Л.: Просвещение, 1982. — С. 72.)

Аднак асаблівую цяжкасць музычнай рэжысуры камедыйных спектакляў уяўляе ўменне пастаноўшчыка знаходзіць сцэнічны эквівалент музычнай драматургіі. Як правільна заўважыў Б.Пакроўскі, "рэжысёрскае мысленне павінна быць сімфанічным... і ўвесь фокус у тым, каб жыццёвыя асацыяцыі ўмець пераўтварыць менавіта ў музычнай форме" (Покровский Б.А. Об авторе и его книге // Михайлов Л.Д. Семь глав о театре. — М.: Искусство, 1985. — С. 6). І лепшыя сучасныя рэжысёры-пастаноўшчыкі музычна-камедыйных спектакляў сваімі сцэнічнымі работамі пацвярджаюць гэта.

**Зімнухова І.В.,**
аспірантка кафедры
народна-інструментальнай творчасці

## ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ФЕСТЫВАЛЬНАГА РУХУ НА БЕЛАРУСІ

Фестывальны рух за апошнія гады значна пашырыўся і памацнеў ва ўсім свеце, у тым ліку на Беларусі.

Фестывалі бываюць надзвычай разнастайныя не толькі па жанрах, але і па маштабах, працягласці. Ёсць такія, што ўключаюць у сябе ўсё багацце мастацтва музыкі, танца, тэатра. Ёсць іншыя, дзе гучаць творы толькі аднаго майстра ці аднаго жанру.

У апошняе дзесяцігоддзе больш увагі сталі звяртаць на народнае мастацтва. Адначасова павялічваецца колькасць міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных фестываляў. Яны найбольш відавочна распаўсюджваюць узоры нацыянальна-культурнай спадчыны, раскрываюць шырокія магчымасці захавання культурных традыцый народа. Так, напрыклад, толькі ў 1996 годзе было праведзена каля дванаццаці фестываляў: І Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур Беларусі (Гродна),

Репозиторий БГУКИ

II Рэспубліканскі фестываль мастацкай творчасці выхаванцаў дзіцячых школ, школ-інтэрнатаў і спецшкол “Вясёлкавы карагод”, Рэспубліканскі фестываль народнай творчасці чарнобыльцаў, Міжнародны фестываль духавой музыкі “Беларускія фанфары”, Міжнародны фестываль народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік” (Паставы), Рэспубліканскі фестываль харавых калектываў “Пеўчае поле” (Мядзельскі раён) і інш. У ліпені 1998 года прайшлі заключныя імпрэзы Першага фестывалю народнага мастацтва Беларусі “Беларусь — мая песня”, якія маюць даўнюю традыцыю. Так, пачынаючы з 1985 года праводзіліся фестывалі і агляды народнай творчасці, прысвечаныя 40-годдзю перамогі і 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. Яны праходзілі ў некалькі этапаў і ахоплівалі вельмі шырокае кола выканаўцаў. Спачатку выступленні праводзіліся ў арганізацыях, потым на гарадскіх, раённых, абласных аглядах.

Правядзенню такіх фестываляў павінна папярэднічаць карпатлівая падрыхтоўчая праца, якая вядзецца стабільнай групай на працягу доўгага адрэзку часу — года і больш. Ужо ў дні самога фестывалю вялікая і адказная частка працы ўскладаецца на добраахвотнікаў — школьнікаў, студэнтаў, пенсіянераў.

Шматлікасць удзельнікаў і гледачоў фестываляў дае падставы гаварыць аб тым, што гэтыя мерапрыемствы з’яўляюцца арганічнай часткай культурнага працэсу і патрабуюць навуковага аналізу. Шкада, што ў Беларусі да гэтага часу не арганізоўваюць “круглых сталоў”, творчых сустрэч і дыскусій, навукова-практычных канферэнцый па пытаннях фестывальнага руху. Усё больш відавочнымі робяцца наступныя недахопы правядзення сучасных фестываляў.

У апошнія гады назіраюцца тэндэнцыя да ўсталявання аднастайнасці народна-танцавальнага жанру, увага арганізатараў да танцавальных калектываў, што маюць камерцыйныя інтарэсы. Гэта збядняе фестывалі, стварае ў гледача аднабаковае ўяўленне аб нацыянальна-

Репозиторий БГУКИ

культурных традыцыях. Палітра беларускага народнага мастацтва надзвычай багатая. Інструментальная і вакальная музыка, сцэнічнае дзеянне і народны гумар упрыгожваюць любое свята. Танцавальна-забаўляльны ўхіл міжнародных фестываляў прывёў да таго, што ў Беларусі з'явіліся танцавальна-экспартныя фальклорныя калектывы, якія штогод выязджаюць на міжнародныя фестывалі і прадстаўляюць там беларускае народнае мастацтва.

Шматлікія фестывалі носяць празмерна заарганізаваны характар, многа часу адводзіцца на рэпетыцыі адкрыцця і закрыцця фестывалю.

Адзначаюцца недахопы арганізацыі быту ўдзельнікаў. З-за эканоміі сродкаў для тых, хто ўдзельнічае ў фестывалях, не арганізуецца мерапрыемстваў, якія знаёмілі б з культурай, бытам, традыцыямі мясцовага насельніцтва.

Кожнаму калектыву даюцца 5—10 хвілін на кожным канцэрце. У выніку яны часам па 2—3 разы ў тыдзень выступаюць з аднолькавымі, найбольш выйгрышнымі праграмамі. На асобных фестывалях няма формы самастойнага канцэрта. Арганізатары, такім чынам, не даюць магчымасці раскрыць сябе, данесці да слухачоў сваё майстэрства.

Часам арганізатары не шукаюць новых цікавых імён і мастацкіх калектываў, а запрашаюць прафесійныя калектывы, кіраўнікамі якіх з'яўляюцца вядомыя выканаўцы.

На нашу думку, зменшыць недахопы ў арганізацыі фестываляў можна, улічваючы наступныя моманты.

Фестывальная праграма павінна быць прадуманай і разнастайнай. Трэба ўлічваць сярэдні ўзрост, мастацкі густ аўдыторыі, якая прыйдзе на фестывальныя канцэрты. Напрыклад, адны пляцоўкі могуць быць прызначаны для дзіцячых гульняў і забаў, іншыя — для мерапрыемстваў з удзелам пажылых наведвальнікаў і інш.

Рэпазіторый БГУКІ

Нельга забываць, што любы фестываль грунтуецца на грамадскай зацікаўленасці. Такі падыход, калі за ўсё плаціць дзяржава, не толькі не стварае стымулаў для паляпшэння якасці мерапрыемстваў, але і ўплывае на эмацыянальна-вобразную сферу гледача. Калі выступленні добрых мастацкіх груп і выканаўцаў ідуць пры напалову пустых залах, то артыст не адчувае адказнасці, не працуе з поўнай аддачай.

Немагчыма прадугледзець добрае надвор'е на дні правядзення фестывалю, але і тут можна пазбегнуць нечаканасці. Ёсць сэнс прааналізаваць надвор'е мінулых гадоў у адпаведны перыяд. На ўсялякі выпадак павінен быць распрацаваны запасны варыянт, як, напрыклад, на ірландскім фестывалі "Салатурн". Асаблівасць яго ў тым, што ён мае дзве аднолькавыя пляцоўкі: адну для паказу спектакляў на вольным паветры, а ў некалькіх метрах ад яе — такую ж самую, але закрытую, каб у выпадку дрэннага надвор'я публіка і выканаўцы маглі хутка перайсці туды.

Яшчэ адной асаблівасцю правядзення фестываляў за мяжой з'яўляецца тое, што іх арганізоўвае Еўрапейская асацыяцыя музычных фестываляў, якая збірае інфармацыю аб удзельніках. У Беларусі такой асацыяцыі няма, таму арганізатары фестываляў адчуваюць інфармацыйны голад. Яны не ведаюць аб існаванні новых, нядаўна створаных калектываў. Арганізатары павінны загадзя друкаваць буклеты, плакаты, што нясуць інфармацыю аб калектывах, а таксама даваць паведамленні ў сродках масавай інфармацыі. Трэба, каб удзельнікі ведалі аб існуючых фестывалях. Напрыклад, у Амерыцы існуе даведнік "Musical America", які змяшчае кароткія звесткі аб фестывалях.

Востра стаіць пытанне аб правядзенні спецыяльнага даследавання для вызначэння фактараў, што спрыяюць захаванню і пашырэнню нацыянальна-культурнай спадчыны ў працэсе арганізацыі, правядзення фестываляў

Репозиторий БГУКИ

народнага мастацтва. Задачамі такога даследавання могуць быць:

— выяўленне прынцыпаў арганізацыі фестываляў народнага мастацтва;

— пошук шляхоў захавання, папулярызацыі нацыянальна-культурнай спадчыны ў ходзе арганізацыі і правядзення фестываляў народнага мастацтва.

Такім чынам, фестывалі — гэта не толькі святы наведвальнікаў і ўдзельнікаў, канцэрты для публікі, але і каталізатары абуджэння цікавасці да культуры, нацыянальных звычаяў, традыцый.

Фестывалі патрабуюць навуковага асэнсавання з мэтай удасканалення аспектаў іх арганізацыі, правядзення, дзеля таго каб прынцып "не нашкодзь нацыянальнай культуры, а дапамажы ёй" стаў асноўным у сучасных фестывалях.

**Вышынская І.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

## САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Культура і чалавек, дыялектыка іх узаемадзеяння займаюць вучоных розных галін навукі. Чалавек па сваёй сутнасці біясацыяльны. З аднаго боку, ён дзіця прыроды, з другога — грамадства, г.зн. соцыуму. Чалавек не нараджаецца сацыяльным, становіцца такім толькі ў працэсе дзейнасці. Ён становіцца чалавекам у поўным сэнсе слова праз культуру. Адукацыя, выхаванне — гэта не што іншае, як авалоданне культурай, працэс перадачы яе ад аднаго пакалення да другога.

Такім чынам, культура абазначае далучэнне чалавека да соцыуму, грамадства. Працэс сацыялізацыі — беспера-



Репозиторий БГУКИ